# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## 10 клас

## Варыянт 1

**Заданне 1.** Запішыце выказванні беларускіх мастакоў слова ў фанетычнай транскрыпцыі.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Планета жыве для людзей. І ніколі не згасне, не згіне. (Н. Загорская.)

[______________________________________________________________

______________________________________________________________]

**Заданне 2.** Ніжэй змешчаны спіс сучасных запазычаных слоў, якія актыўна ўжываюцца ў беларускай мове. Для кожнага з іх трэба:

1. Даць кароткае тлумачэнне значэння.
2. Прапанаваць адзін ці два беларускія адпаведнікі (неалагізмы), якія маглі б выкарыстоўвацца замест запазычання.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*



*Аватарка*



*QR-код*



*Хэштэг*

**Заданне 3.** Падбярыце да змешчаных у левым слупку назоўнікаў патрэбныя словы з наступнага абзаца так, каб склаліся фразеалагізмы. Для гэтага як самім апорным назоўнікам, так і падабраным словам пры неабходнасці надайце патрэбную граматычную форму. Запішыце атрыманыя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *ад, адбівацца, адчынены, вузкі, высмоктваць, грэць, даваць, з, задні, ламацца, на, сустракацца, у (ў).*

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | |
|---|---|---|
| *дарожка* | ‘уступаць у непрымірымыя супярэчнасці з кім-н., узаемна варагаваць’ | |
| *дзверы* | ‘настойліва сцвярджаць, даказваць тое, што даўно ўсім вядома і не выклікае пярэчанняў’ | |
| *дом* | ‘рэдка бываць дома, не цікавіцца дамашнімі справамі’ | |
| *палец* | ‘гаварыць, сцвярджаць што-н. без належных падстаў; выдумваць’ | |
| *рука* | ‘нажывацца несумленным спосабам’ | |
| *ход* | ‘адступаць ад раней сказанага, зробленага, адмаўляцца ад ранейшага намеру, рашэння’ | |

**Заданне 4.** Ад прапанаваных слоў утварыце суфіксальным спосабам шэсць назоўнікаў, якія абазначаюць асобу чалавека. У якасці ўтваральных выкарыстоўвайце толькі тыя словы, ад асноў якіх назвы асобы могуць быць утвораны непасрэдна.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| *хадзіць* | | *апавяданне* | |
| *жарт* | | *паўстанне* | |
| *востраў* | | *Балівія* | |
| *раман* | | *пілатаваць* | |
| *пагоня* | | *барацьба* | |

**Заданне 5.** На аснове прапанаваных слоў запоўніце табліцу, выпісаўшы ў правы слупок слова (словаформу) адпаведна пазначаным у левым слупку патрабаванням.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | |
|---|---|---|
| **1** | ***Назоўнік з канчаткам -ы:*** журы, араты, куцы, заўзяты | |
| **2** | ***Прыметнік, які мае адну прыстаўку:*** абясшкоджаны, незвычайны, безвыніковы, безуцешны | |
| **3** | ***Займеннік, які мае два канчаткі:*** хто-небудзь, абы-які, сёе-тое, камусьці | |
| **4** | ***Лічэбнік, які не змяняецца па родах:*** два, пяцідзясяты, тысяча, паўтара | |
| **5** | ***Дзеяслоў, у якім канчатак 1-й асобы адзіночнага ліку складаецца з аднаго зычнага гука:*** карміць, адчуваць, перадаць, наядацца | |
| **6** | ***Дзеепрыслоўе, утворанае ад дзеяслова II спражэння:*** пад’еўшы, крычучы, абрэзаўшы, высекшы | |

**Заданне 6.** Пры электронным перакладзе з рускай мовы на беларускую ў некаторых сказах былі дапушчаны маўленчыя памылкі. Дапамажыце іх выявіць, патлумачыць і паправіць. Улічыце, што сярод прапанаваных могуць быць як сказы з памылкамі, так і без памылак.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| № сказа | Сказ |
|---|---|
| 1 | Сымон Будны не толькі заклікаў усіх грамадзян паважаць дзяржаўныя законы, але і шанаваць бацькоўскую зямлю і матчыну мову, сумленна выконваць свае абавязкі. |
| 2 | Напісаны ад рукі рукапісны часопіс брыгады “Полымя” Мінскай вобласці нагадвае аб’ёмную кнігу з вялікай колькасцю ілюстрацый. |
| 3 | Музей касманаўтыкі ў Тамашоўцы складаецца з трох зал: гістарычнай, экспазіцыйнай, біяграфічнай. |
| 4 | Археалагічныя раскопкі дазваляюць сцвярджаць, што на момант узвядзення Сафійскага сабора Полацк быў адным з буйнейшых гарадоў ва Усходняй Еўропе. |
| 5 | Дажынкамі называлі таксама і старажытнае народнае свята, звязанае з заканчэннем жніва, якое існавала на беларускіх землях з даўніх часоў. |
| 6 | Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр “Зубраня” стала сапраўдным сімвалам дзіцячай дыпламатыі, моцнага сяброўства. |

| № сказа | Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці) | Выпраўлены варыянт сказа |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |
| 4 | | |
| 5 | | |
| 6 | | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Накинулась зима на зверей. Запорошила снегом поля, завалила сугробами леса, одела деревья ледяной корой и посылает мороз за морозом. Идут морозы один другого злее, с елки на елку перепрыгивают, потрескивают да пощелкивают, зверей пугают. Не испугались звери: у одних шубы теплые, другие в глубокие норы запрятались; белка в дупле орешки грызёт; заинька, прыгая, греется, а лошадки, коровки, овечки давным-давно в тёплых хлевах готовое сено жуют, тёплое пойло пьют. *(По К. Ушинскому.)*

---

**Заданне 8.** Запішыце літаратуразнаўчыя тэрміны і паняцці, азначэнні якіх запісаны ніжэй. Якія з гэтых тэрмінаў можна выкарыстаць пры характарыстыцы ўрыўка з верша Алеся Бадака “Песня”? Пастаўце знак “+” (плюс) у адпаведнай графе.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | |
|---|---|
| **А** | адзін з трох родаў літаратуры, які паказвае рэчаіснасць праз суб’ектыўнае выяўленне пачуццяў, перажыванняў аўтара, яго лірычнага героя |
| **Б** | род літаратуры, у якім выкарыстоўваецца апавядальны спосаб паказу жыцця ў сюжэтным развіцці. Вызначаецца шырынёй ахопу падзей, характараў, абставін, малюнкаў прыроды |
| **В** | жанр сярэдневяковай літаратуры, у якім распавядаецца пра ўзорнае жыццё людзей, кананізаваных царквой |
| **Г** | форма лірычнага верша з васьмі радкоў, у якім два першыя і два апошнія, а таксама першы і чацвёрты радкі аднолькавыя |
| **Д** | тое, пра што расказваецца ў творы, або прадмет апісання, выяўлення, асэнсавання |
| **Е** | частка мастацкага твора, якая ідзе пасля заканчэння сюжэта (асноўнага дзеяння) |
| **Ж** | мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе прадмет, з’яву або чалавека |
| **З** | двухскладовая стапа з націскам на другім складзе |

*Душа з гадамі асцярожней*
*Ляціць на позняе святло.*
*А вы паклікалі – ці можна*
*Не адазвацца ёй было?!*

*А Вы паклікалі і самі,*
*Відаць, не ведалі аб тым,*
*Што белы май плыве над Вамі,*
*А нада мной – асенні дым.*

| **Абазначэнне тэрміна** | **Тэрмін** | **Тэрмін можна выкарыстаць пры характарыстыцы** |
|---|---|---|
| **А** | | |
| **Б** | | |
| **В** | | |
| **Г** | | |
| **Д** | | |
| **Е** | | |
| **Ж** | | |
| **З** | | |

**Заданне 9.** Устанавіце адпаведнасць паміж назвамі мастацкіх твораў і іх фіналамі. Неабходныя лічбы запішыце ў ячэйках побач з адпаведнымі літарамі. У наступнай ячэйцы запішыце аўтара гэтага твора.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **А** | “Паром на бурнай рацэ” | | **В** | “Мая Бесядзь” | | **Д** | “На каляды к сыну” |
| **Б** | “Хмарка” | | **Г** | “Кепска будзе!” | | **Е** | “Роднае карэнне” |

| | |
|---|---|
| **1** | У цёплых, добрых бягучых хатках ехалі людзі, ехалі са сваім горам і радасцю.<br>– Ча-чах, ча-чах-стук – шпарка дужа грукаталі-чахалі, – чах-чах, ча-чах-стук, – тахалі колы вялікія пад вагонамі.<br>Падуў ціхі ветрык, заківаў лазу над канаваю і траўку змірную прыдарожную.<br>“І трыста, чатырыста гадоў назад таксама дуў ён тут, ветрык, і таксама калыхаў-цалаваў траўку сумную і маўклівую... толькі цуда-машыны не было”, – памысліў студэнт і замаркоціўся... |
| **2** | Ён схіліў галаву.<br>– Рушай, – сказала яна фурману пасля хвіліны цяжкага маўчання. – Бывайце, дарагі.<br>– Бывайце.<br>Брычка павольна пакацілася па дарозе...<br>А ён стаяў і глядзеў, як брычка, зрабіўшыся цёмнай кропкай, знікала недзе пад чорнымі хмаркамі, ад якіх цягнуліся да зямлі шэрыя завесы дажджу. |
| **3** | Стары Дуб, абмыўшыся дажджом, павесялеў і сказаў да Бусла, з якім даўно ўжо быў у дружбе:<br>– От навука для тваіх дзяцей. Моцна ж накажы ты ім, дружа, каб не лёталі дарэмна па свеце, не бадзяліся: у сваім родным кутку работы досыць для кожнага.<br>Бусел маўчаў. Відаць, ён іначай пазіраў на гэту з’яву, а можа, і не дачуў слоў свайго сябра. |
| **4** | Возера замёрзла, але ўсярэдзіне былі павадкі на лёдзе і бліўчэлі на чырвоным ад марозу сонцы. Блішчыць снег. Варона акалелая знедкуль узялася. Па снегавой дарозе коламі гармат глыбокія выбіты калюгі. Асцярожна спускаецца з гары калона войска адступаючага, як нейкая шэрая ўстужка, толькі трапечацца і безупынна паўзе.<br>Адздзі і справа гудзіць глухая, асцервянелая, нястрыманая кананада.<br>Хутарок цямнеючаю плямаю астаецца далёка адздзі. |
| **5** | Бо прагай да працы ахоплены часта я,<br>І сэрца абпалена смагай радка,<br>Бо жыць не магу,<br>Як ка́ня няшчасная,<br>Кропляй дажджу з лесавога лістка. |
| **6** | Асэсар быў ужо новы,<br>Чалавечак так, нічога,<br>Якісь ціхі, нездаровы<br>І цярплівы... хваліць Бога!<br>Пасля таго праз паўгоду<br>Ў марцы ж мяне на свабоду,<br>Дзякуй Богу, адпусцілі<br>У той дзень, як і хрысцілі. |

| | |
|---|---|
| **7** | Ачухалася толькі тады, калі той самы лёкай яшчэ раз выйшаў да яе і торкнуў ёй у скручаныя ад холаду пальцы нейкія паперкі...<br>– Ад пана!..<br>Яна нават не чула, як з яе акалелых пальцаў выпаў гасцінец роднага, доўгажаданага сына. Некалькі трохрублёвых паперак прыліплі да макраватага тратуара... |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **А** | | | **Г** | | |
| **Б** | | | **Д** | | |
| **В** | | | **Е** | | |

**Заданне 10.** Летась адзначалася 95-годдзе з дня нараджэння аднаго з самых цікавых пісьменнікаў ХХ стагоддзя. Ён вядомы сваімі захапляльнымі эпічнымі творамі, неверагоднымі вершамі і п’есамі. У адной з аповесцяў пісьменнік паказвае гісторыю свайго народа праз таямнічыя гісторыі. Галоўным героем гэтага твора з’яўляецца фалькларыст, які прыязджае ў глухі куток збіраць легенды і паданні. Адна з іх тлумачыць праклён мясцовага старажытнага магнацкага роду.

**Прыгадайце і запішыце аўтара і назву твора, а таксама імя галоўнага героя – збіральніка фальклору.**

Уявіце, што паводле гэтай аповесці здымаецца фільм. Ваша задача – стварыць жывы і яркі вобраз героя на экране. Каб дапамагчы гэта зрабіць, **складзіце тры парады для акцёра, які выконвае ролю фалькларыста.** Парады павінны быць накіраваны на раскрыццё стану героя для перадачы аўтарскай думкі падчас першай сустрэчы з прадстаўніцай таго самага магнацкага роду. **Першая з парад павінна тычыцца адзення героя (не забывайце пра эпоху!), другая – яго мімікі і жэстаў, трэцяя – інтанацыі. Апішыце эпізод, для якога будуць актуальныя парады, пры якіх абставінах пазнаёміліся героі, які час апісваецца, месца сустрэчы (апісанне да 100 слоў).**

| | |
|---|---|
| **Аўтар** | |
| **Назва твора** | |
| **Імя фалькларыста** | |

**Эпізод:**

______________________________________________

| № п.п. | Парады |
|---|---|
| 1 | |
| 2 | |
| 3 | |